СВЯТА ВЁСКІ

# Радавая спадчына

**У пяты раз сёлета ўраджэнцы Пагост-Загародскага, некалі мястэчка і цэнтра акругі, а цяпер вёскі ў Пінскім раёне, сабраліся на малой радзіме на сустрэчу з роднымі і блізкімі, з дзяцінствам і юнацтвам. Некаторыя нанова знаходзілі свае вытокі, вярталіся да радавой спадчыны.**



Так, напрыклад, адбылося з расійскай паэтэсай Таццянай Сцяпанавай. Яна завітала на радзіму продкаў, упершыню ў жыцці прыехала ў Беларусь, на Піншчыну, знайшла тут родных, сувязь з якімі была страчана шмат год таму. У час паездкі ў яе нарадзіўся верш, які паэтэса пачала сімвалічна: «Есть истина: побегов не бывает без корней…». Своеасаблівым вяртаннем да сваіх каранёў для Таццяны стала свята «Пагост сустракае землякоў», уражанні ад якога яна павезла ў далёкі Югорск Ханты-Мансійскай аўтаномнай акругі. І такіх гісторый у летапісу населенага пункта шмат. Абставіны ў былых жыхароў Пагост-Загародскага розныя, але імкненне ва ўсіх адно – прайсціся сцяжынкамі, па якіх хадзілі дзяды і прадзеды, знасці карані сямейнага дрэва. І больш не губляць.

«Свята з'яўляецца жамчужынай у каралях культурных падзей Піншчыны. Вялікая яго каштоўнасць у тым, што яно пайшло ад вас, ад землякоў, ад неабыякавых людзей», – падкрэсліў, вітаючы пагост-загародцаў, загадчык сектара ідэалагічнай работы і па справах моладзі Пінскага райвыканкама Сяргей Падшывалаў. Сапраўды, менавіта дзякуючы высілкам ураджэнцаў Пагост-Загародскага, якія хвараюць за лёс роднай вёскі, зроблена многае. Старшыня мясцовага сельвыканкама Алена Багатка нагадала, што выдадзены шэраг кніг пра Пагост, летась пачаў працаваць мясцовы дабрачынны фонд. Дарэчы, на сродкі, сабраныя ім, уладкавана дзіцячая гульнёвая пляцоўка, пастаўлены помнік ахвярам вайны, добраўпарадкаваны могілкі. А падчас сёлетняга свята збіралі кнігі, іх перадалі ў бібліятэку мясцовай школы, якая сёлета адзначае 160-годдзе (звесткі ў архівах аб даце адкрыцця ў паселішчы школы знайшоў Іосіф Рубаха).

Падзякі райвыканкама за ўклад у захаванне і адраджэнне гісторыі і культуры малой радзімы ўручылі дырэктару дабрачыннага фонда Пятру Карастылёву і ўраджэнцы вёскі Любові Хоміч. Шчыра і не адзін раз дзякавалі на свяце Аляксандру Казаку, аўтару і складальніку кніг, ініцыятару правядзення жнівеньскіх сустрэч на малой радзіме. Сярод аўтараў новай кнігі «Погост-Загородский. Годы, века, тысячелетия» – выпускніца мясцовай школы, выкладчык, выдатнік народнай асветы БССР Валянціна Раманцэвіч і вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Рэспублікі Беларусь, кандыдат гістарычных навук Мікалай Крывальцэвіч. «Пагост і яго ваколіцы – адна з найбольш даследаваных археолагамі мясцін у Беларусі, – адзначыў вучоны. – Спадзяюся, у вёсцы будзе музей, дзе атрымаецца паглядзець знойдзенае. Беражыце гэтае месца. Гэта ваша гісторыя. Вы – паслядоўнікі старажытнай культуры».

**Людміла РЭБКАВЕЦ**
**Фота аўтара**